Дунаева І.С., выпускніца
спецыялізацыі “Этнафоназнаўства”
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Пладунова Т.А.,
выкладчык

# ТРАДЫЦЫІ “ЗЯЛЁНЫХ СВЯТАК” НА БЕЛАРУСІ: ВЫВУЧЭННЕ І АДАПТАЦЫЯ Ў СУЧАСНЫХ ФОРМАХ ФАЛЬКЛАРЫЗМУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этнафонія веснавога цыкла ўключае некалькі груп песень, якія канцэнтраваліся вакол пэўных абрадаў і свят. Мяркуючы па фальклорна-этнаграфічных апісаннях, зробленых у XIX-XX стагоддзях і ў наш час у розных раёнах Беларусі, гэты цыкл складаўся з наступных звёнаў: абрады гукання вясны; абрады і звычаі Вялікадня; абрады на Юр’я; “зялёныя святкі”; г. зн. абрады і звычаі, звязаныя з Сёмухай, Троіцай, Русальным, або граным тыднем. “Зялёныя святкі” прыпадаюць на канец вясны (фактычна провады вясны). Гэтыя абрады і адпаведныя ім песні былі звязаны з культам продкаў і ўшанавання расліннасці, зеляніны, кветак, дрэў.

Народная назва “Сёмуха” паходзіла ад таго, што гэта свята адбывалася праз сем тыдняў пасля Вялікадня. Хоць яно святкавалася тры дні, увесь Сёмушны тыдзень звалі Клечальным і нічога не рабілі. Сёмуху называлі яшчэ “Зялёным” святам па той прычыне, што ў сёмушныя дні асабліва вялікая ўвага надавалася зеляніне. Ёсць розніца паміж траецкай зелянінай, якая была на дрэве і ў хаце. Існуюць пэўныя суадносіны паміж рознымі відамі зеляніны, што датычыцца пэўных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў.

У траецкіх абрадах некалі быў магічны сэнс: земляробу неабходна было “запасціся жыватворнымі сіламі на весь год, шляхам кантактнай магіі запазычыць яе у пэўных сіл прыроды, у прыватнасці у бярозы. Бяроза распускаецца першай з дрэў, сок яе карысны; бярозавыя дровы гараць асабліва добра, даючы шмат цяпла; з кары бярозы рабілі розныя прадметы гаспадарчага ужытку, абутак. Відаць, усе гэтыя якасці некалі зрабілі бярозу дрэвам-фетішам, а абрады звязаныя з ім вельмі важнымі” [1, 47] .

У той жа час “Зялёныя святкі” і песні, якія пад час іх спяваліся, мелі і іншае абрадавае прызначэнне, звязанае з шлюбнымі адносінамі. Сам абрад быў своеасаблівай формай прыняцця “у род жанчын” дзяўчат, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту. Заключэнне шлюбу лічылася патрэбным у мэтах уздзеяння на урадлівасць зямлі. Пры кумленні дзяўчаты, якія цалаваліся праз вянок з бярозы ці прайшлі праз вароты, лічыліся кумамі (адсюль і назва абрада), неразлучнымі сяброўкамі на ўсё жыццё альбо на тэрмін свята.

Сёмуха лічылася яшчэ святам у гонар ушанавання продкаў. Сёмушныя дзяды адлюстроўвалі сабой пашыраны ў старажытнасці культ продкаў [3, 101] . Верылі, што ў гэты дзень душы памерлых наведваюць родныя мясціны і нават нябачныя прысутнічаюць у святочным застоллі.

Паколькі мы маем некалькі розных назваў аднаго абрада і яго розных спосабаў ўвасаблення ў прыродным ландшафце, хацелася б каратка акрэсліць рэгіянальнае бытаванне кожнага з іх:

**«Ваджэнне куста» на Пінскім Палессі**

Праведзеныя палявыя даследаванні дазволілі дакладна акрэсліць арэал абраду, які знаходіцца ў асноўнам на тэрыторыі Беларусі. Гэта тэрыторыя сучаснага Пінскага р-на. Святкаванне троіцы ў пінчукаў пачынаецца рытуальным аздабленнем зелянінай сваіх двароў і хат. Гэта робяць ў перадтроіцкую суботу. Куставы абрад праводіцца ў панядзелак на другі дзень Тройцы. Куст –старажытная язычніцкая назва абраду, і галоўнага персанажа (дзяўчыны, упрыгожанай ў зелле), песенны вобраз. Асноўныя рытуальныя дзеянні абраду адбываюцца ў асяродку мясцовага соцыуму. Абрадавая група на чале з цэнтральнай фігурай –“Кустам”-, абходзіць падвор’і з мэтай спрыяння дабрабыту ў сям’і і гаспадарцы [1, 56 ].

**«Провады русалкі» на Цэнтральным Палессі**

Наступны тыдзень пасля Сёмухі меў назву русальнага, праваднога, гранога тыдня - дні праводзін вясны. Узнікненне русальных песень звязана з міфалагічнымі павер’ямі пра русалак. Народнае ўяўленне насяляла імі рэкі, азёры, паляны, жытняе поле. Лічылася, што русалкі жаночападобныя істоты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія паходзяць з памёрлых немаўлят жаночага полу, а таксама з тапельніц [2, 52-53 ]. Русальныя песні спявалі на так званым Граным тыдні, што наступаў на Сёмуху. Выконвалі іх найчасцей як суправаджэнне абраду. Русальныя песні завяршалі веснавы цыкл гадавога круга песень.

**«Ваджэнне і пахаванне стралы» на Веткаўскім Пасожжы**

Адной з найбольш цікавых і непаўторных з'яў у беларускім традыцыйным календары можна лічыць абрад, «Ваджэння і пахавання стралы», рэгіён бытавання якога лакалізаваны ў межах Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей ("Сула"), але своеасаблівым эпіцэнтрам найбольш пашыранага існавання абраду з'уляецца Веткаўскі раён і найперш некалькі яго вёсак: Стаўбун, Казацкія Балсуны, Дуброва, Неглюбка, Янова, Пералёўка, Слабада, Барталамееўка.

Мастацкую рэканструкцыю абрадавых цырымоній Сёмухі магчыма здзейсніць у гарадскіх умовах праз даследаванне рэгіянальных традыцый, арганізацыйна-метадычны і рэпетыцыйны этапы ў рамках фальклорнага гурта (цэнтра) [4, 128]. Гарадское свята можа злучаць ў сабе праявы некалькіх рэгіянальных традцый і характарызуецца іх пэўным спрашчэннем. Сапраўды, пры адпраўленні таго ці іншага абраду ва ўмовах сучаснай рэканструкцыі непазбежны элементы мастацкага пераасэнсвання, аднак яны маюць на мэце падкрэсліць сэнсавыя асаблівасці абрадавага свята, не парушаючы нормаў народнай этыкі і эстэтыкі і пакідаючы месца для імправізацыі выканаўцаў [4, 127].

На прыкладзе правядзення "Зялёных святак" у парку Цэнтральным дзіцячым парку М.Горкага г. Мінска, арганізатарам якога з'яўлялася выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Т.А.Пладунова паспрабуем прааналізаваць вопыт мастацкага рэканструявання траецкай этнафоніі розных рэгіёнаў Беларусі. У першай частцы свята - "Завіванні вянкоў" - была ўвасоблена абрадавая дзея збору зёлак і завівання дзяўчатамі вянкоў, пашыраная ва ўсіх рэгіёнах Беларусі**,** мэтай якой з'яўлялася ўшанаванне раслінасці і замова продкаў на ўрадлівасць і спрыт ў гаспадарцы, замова на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суджанага. Мэта гэтай часткі абраду была еднасць чалавека з чалавекам і прыродай.

Адным з ключавых этапаў свята стаў рытуал “Кумленне” у свяшчэнным гаі, у якім фальклорныя гурты ушаноўвалі адпаведнай траецкай ці веснавой песняй кожны сваё “жаночае” дрэва-татэм, а пасля дзяўчаты абменьваліся адна з адной вянкамі “на добыя гады, на доўгае сяброўства”. Спеўныя карагоды гуртоў вакол “сваіх” дрэў гучалі адначасова, пасля пераходзілі ў агульныя з суседнімі гуртамі, і ў “крывы танок” па ўсім гаі ў бясконцым каноне песні “Мядуніца лугавая”. Завяршалася “дзявочая” дзея ўслаўленнем прыроды і квітнеючай пары пераходу вясны на лета – агульнай песняй “Добры дзень, лета!”.

Што тычыцца заключнай, рэкрэацыянай часткі, якая была прадстаўлена як “Танцавальна-гульнёвая феерыя “Заскокванне Куста”. Яе магчыма акрэсліць як інтэрактыўную форму правядзення забаўляльна-рэкрэацыянай дзеі па прынцыпу: “тыя, хто танчаць, запрашаюць тых, хто не танчыў”. З гледачамі развучвалі танцы і гульні калектывы г. Мінска, Любань, фальклорны гурт “Мегува” г. Палангі (Літоўскай Рэспублікі). На свяце прысутнічала вялікая колькасць гледачоў, якія не мелі непасрэднай сувязі з фальклорам, але яны праяўлялі сваю зацікаўленасць на працягу ўсяго свята. Гэта гаворыць аб тым, что наша сучасная моладзь цікавіцца народнымі традыцыямі і здольна ўліцца ў спеўную і музычна-танцавальную стыхію каляндарнага свята.

У кожным горадзе ў ашчаднай стылізацыі магчыма аднавіць такое прыгожае свята і дасягнуць пастаўленых задач: рэканструяваць абрад (праз песню, музыку, дзеі і атрыбутыку), аб’яднаць духоўна дзяцей, моладзь і старэйшае пакаленне ў асяроддзі прыроды, пазнаць усе сакральныя моманты свята, перажыць іх сваім сэрцам і захаваць на доўгі час у сваёй памяці.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. ”Беларускія народныя абрады” / Склад., навук. рэд. І прадм. Л. П. Касцюкавец.- Мн.: Беларусь, 1994. – 128 с.

2. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; уступ. Арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса, 2-е выд., выпр. - Мн.: Бел. навука, 2003. – 429 с.

3. Ліцьвінка В.Д. “Святы і абрады беларусаў.”- Мн.: Беларусь, 1997. -176 с.: іл.

4. Пладунова Т. Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы»// Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманння: зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29-30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2010. – 168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ